Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"

30 красавіка 2010 года, № 8 (2024)

ДАСЯГНЕННІ

## ХРУСТАЛЬНЫ ГЛОБУС ЗА САЙТ



*Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў у захапленні ад заваёвы БДУ*

***Веб-рэсурс www.bsu.by Беларускага дзяржаўнага універсітэта прызнаны найлепшым у намінацыі "Адукацыя і навука" на 17-й Міжнароднай спецыялізаванай выставе-кангрэсе па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях "ТІВО-2010".***

"Хрустальны глобус" і дыплом рэктару БДУ Сяргею Абламейку ўручыў 22 красавіка на ўрачыстай цырымоніі ў кангрэс-холе бізнес-цэнтра "Вікторыя" міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў. Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ (дырэктар – Юрый Варатніцкі) атрымаў дыплом за распрацоўку і прасоўванне сайта.

Апроч гэтага гучнага поспеху, двума дыпломамі ў намінацыі "Бібліятэкі. Сеткавыя сэрвісы" ўзнагароджаны загадчык аддзела інтэрнэт-тэхналогій ЦІТ БДУ Андрэй Пупко як аўтар і распрацоўшчык сайта *www.ship.bsu.by*, аднаго з найбольш папулярных рэсурсаў у дамене bsu.by. Спецыяльную прэмію журы атрымаў Інстытут журналістыкі БДУ за распрацоўку сайта дзіцячай газеты "Зорька", які стаў прызёрам конкурсу. Таксама быў адзначаны сайт *www.asabliva.by*, распрацаваны Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій БДУ і Галоўным інфармацыйна-аналітычным цэнтрам Міністэрства адукацыі Беларусі.

Інтэрнэт-прэмія "ТІВО" штогод прысуджаецца сеткавым праектам, створаным у беларускім сектары Інтэрнэт, за важкія мастацкія, тэхналагічныя і сацыякультурныя дасягненні ў галіне інфармацыі, культуры, мастацтва і адукацыі. Усяго на спашуканне інтэрнэт-прэміі "ТІВО-2010" у 11 намінацыях было пададзена 369 заявак – амаль на 20% больш, чым летась. Сайты ацэньваліся па такіх крытэрыях, як змест, структура і навігацыя, візуальнае афармленне, функцыянальнасць, інтэрактыўнасць. У склад журы традыцыйна ўвайшлі ІТ-спецыялісты, прадстаўнікі творчых саюзаў, акадэмічнай навукі, СМІ, органаў дзяржкіравання і айчынных прадпрыемстваў.

Найбуйнейшая ў краіне выстава па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях "ТІВО" праводзіцца з 1994 г. Яна ўнесла істотны ўклад у інфарматызацыю Беларусі. З 2003 г. у конкурсе ўзялі ўдзел больш за 4 тыс. беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**
Фота Аляксандра СНАПКА

СЛОВА СТУДЭНТУ

## ДЫЯЛОГ – ПАЧАТАК ДЗЕІ

***Каля 600 замежных студэнтаў мелі магчымасць 16 красавіка сустрэцца з кіраўніцтвам БДУ на чале з рэктарам акадэмікам Сяргеем Абламейкам і абмеркаваць надзённыя пытанні жыцця і вучобы ў альма-матэр. Такое маштабнае мерапрыемства адбылося ўпершыню, і гэта, бадай, сведчыць пра істотныя зрухі ў дачыненні да іншаземных навучэнцаў.***



Адміністрацыя БДУ нездарма надае шмат увагі замежным грамадзянам. У апошнія гады дзверы універсітэта гасцінна адчыніліся для больш чым 1700 чалавек з 47 краін, і гэтая лічба з году ў год толькі павялічваецца. І зразумела, бо БДУ – флагман вышэйшай адукацыі ў Беларусі і адлюстроўвае ўсе прыярытэты дзяржаўнай палітыкі.

Не кожны дзень студэнтам даводзіцца ўвачавідкі сустракацца з вышэйшым кіраўніцтвам універсітэта. А тут у прэзідыуме людзі, якія кампетэнтна могуць адказаць на ўсе пытанні, што датычацца камфортнага жыцця і плённага навучання ў ВНУ: рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, першы прарэктар Міхаіл Жураўкоў, начальнік упраўлення міжнародных сувязяў Уладзімір Ціханаў.

У сваім выступленні рэктар пазнаёміў замежных грамадзян са слаўнай гісторыяй установы, лічбамі і фактамі праілюстраваў сённяшні стан і зрабіў прагноз развіцця БДУ. Яго запрашэнне да дыялогу знайшло жывы водгук у студэнтаў, якія ледзьве не ў чаргу да мікрафона пасталі. Давялося адказваць не толькі арэапагу, шмат тэм датычылася наладжвання побыту ў інтэрнатах, таму яны былі адрасаваны дырэктару Студгарадка Міхаілу Чарапеннікаву – сустрэча атрымалася з трохбаковай сувяззю. Юнакі і дзяўчаты здабылі карысную інфармацыю, адміністрацыя адчула агульны настрой, пачула заўвагі і пажаданні. Іх адзначылі для сябе і дэканы факультэтаў, якія таксама амаль у поўным складзе прысутнічалі на сустрэчы.

Відавочна, што замежныя студэнты актыўна шукаюць сваё месца ў соцыуме: многія запыты датычыліся практыкі, пражывання і аплаты навучання на ўзроўні беларусаў, была і размова пра адукацыю ў Беларусі і Еўропе, пра падручнікі і вывучэнне замежных моў у большым аб’ёме, пра ўвядзенне новых дысцыплін і адкрыццё новых альбо адрамантаваных інтэрнатаў, а таксама пра арганізацыю вучэбнай практыкі. Знайшлося шмат ахвотных трапіць на лячэнне ў санаторый-прафілакторый БДУ. Ад жыхароў інтэрнатаў у Шчомысліцы прагучалі нараканні на нязручны рух аўтобуса № 47 і на перабоі з гарачай вадой. Вельмі пацешыў і разняволіў моладзь эпізод са скаргай турэцкага юнака наконт прусакоў у пакоі, на што рэктар іранічна заўважыў, што гэтых “жывёлінак” яму даводзілася бачыць і ў пяцізоркавых атэлях. Тым не менш паабяцаў неўзабаве прыехаць і на месцы разабрацца, у тым ліку і з забеспячэннем вадой.

Ніводная з праблем не засталася па-за ўвагай. Прыемна і тое, што студэнты не толькі пыталіся або крытыкавалі, але і выступалі з ініцыятывамі, напрыклад, па стварэнні Саюза замежных студэнтаў БДУ, якую рэктар адразу ж ухваліў.

Напрыканцы Сяргей Абламейка заўважыў: “Гледзячы сёння на такі вялікі атрад замежных грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў БДУ, я адчуваю гонар і радасць. Мы – адна вялікая сям’я. І ў нас, як у кожнай добрай і моцнай сям’і, павінна быць узаемаразуменне, адказнасць, цярплівасць і павага адзін да аднаго!”

Пасля сустрэчы рэакцыя студэнтаў-удзельнікаў была неадназначнай: адны з радасным узбуджэннем абмяркоўвалі будучыя змены, іншыя казалі, што не так хутка ўсё атрымаецца, бо для гэтага патрэбны не толькі дыялог са студэнтамі, але і добрае фінансаванне і шмат іншых важкіх фактараў. Што ж, яшчэ будзе магчымасць зрабіць высновы: па словах рэктара, такія сустрэчы мяркуецца зрабіць штогадовымі.

**Кацярына РАМАНАВА**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

### Чытайце ў нумары:

ДА 65-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ
Гутарка з намеснікам старшыні Савета ветэранаў БДУ Леанідам ЦЕГІНЫМ і гісторыкам Альбертам КОТОВЫМ
Стар. 2

ГОДНАСЦЬ БДУ АДСТОЙВАЮЦЬ ЮРЫСТЫ
Начальнік упраўлення прававой работы Алена ШВАКАВА распавядае пра найбольш слушныя справы за 10-годдзе працы падраздзялення
Стар. 3

АДШЛІФАВАНЫ АЛМАЗ
Студэнт юрыдычнага факультэта Аляксандр КІКІНЕЎ вярнуўся з чэмпіяната Еўропы па грэка-рымскай барацьбе з залатым медалём
Стар. 4

## Весткі з рэктарата

У АДПАВЕДНАСЦІ з распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за выдатны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі на 2010 год установлены штомесячныя персанальныя надбаўкі ў памеры 12-кратнай тарыфнай стаўкі першага разрада наступным супрацоўнікам БДУ: у галіне навукі – вядучаму навуковаму супрацоўніку кандыдату тэхнічных навук *Аляксандру Драпезу* і дэкану хімічнага факультэта доктару хімічных навук, прафесару *Уладзіміру Панькову*; у галіне адукацыі – загадчыку кафедры матэматычных метадаў тэорыі кіравання, доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару *Веніяміну Кротаву*; дацэнту кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл кандыдату біялагічных навук, дацэнту *Аляксандру Сідараву*; прафесару кафедры неарганічнай хіміі, доктару хімічных навук *Яўгену Стральцову* і загадчыку кафедры ядзернай фізікі, доктару тэхнічных навук, прафесару *Віталю Ямнаму*.

***

ШЭРАГ выкладчыкаў БДУ ўдастоены высокіх узнагарод. За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, значны ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь узнагароджаны загадчык кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта прафесар *Вячаслаў Рагойша*, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь – загадчык кафедры гісторыі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта доктар гістарычных навук *Уладзімір Кошалеў*, прафесар гэтай жа кафедры доктар гістарычных навук *Уладзімір Коршук*, а таксама дэкан філалагічнага факультэта доктар філалагічных навук *Іван Роўда* і прафесар філалагічнага факультэта *Мікалай Піпчанка*.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

*Калі больш за дваццаць год таму Леанід ЦЕГІН прыйшоў у Савет ветэранаў БДУ, арганізацыя налічвала 221 удзельніка Вялікай Айчыннай вайны. Зараз у ёй засталіся 62 чалавекі. З кожным годам меншыцца колькасць тых, хто на свае вочы бачыў усе жахі той далёкай трагедыі, але гэта не значыць, што мы мусім забывацца на тых, хто 65 год таму падарыў нашай зямлі надзею на светлую будучыню, ці на тых, хто можа расказаць, што тады адбывалася. Проста…як было…без усялякага афіцыёзу.*

# ПРОСТА… ЯК БЫЛО…



**ЦЕГІН Леанід Рыгоравіч** (на здымку ў цэнтры) нарадзіўся 11 чэрвеня 1927 г. у Пяцігорску (Стаўрапольскі край). Маёр інжынернай службы. Удзельнічаў у баях супраць бандфарміраванняў у прыфрантавой зоне, у Польшчы (1944–1945 гг.).

Камандзір аўтамабільнага ўзвода (1951–1953). Камандзір тэхнічнай роты (1954–1959) і начальнік аўтаслужбы авіяцыйна-тэхнічнай базы Дальняй авіяцыі (1959–1974). Намеснік начальніка Рэспубліканскага клуба ДТСААФ БССР (1974–1975). З 1976 г. – загадчык лабараторыі кафедры фізікі цвёрдага цела БДУ.

Узнагароджаны медалямі "За баявыя заслугі", "За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне", 19-цю іншымі медалямі СССР, РБ. У цяперашні час – намеснік старшыні Савета ветэранаў БДУ. Член Савета ветэранаў Маскоўскага раёна г. Мінска і Савета ветэранаў г. Мінска.

***– Леанід Рыгоравіч, як і дзе для Вас распачалася вайна?***

– У населеным пункце Тыянхара, за 27 кіламетраў за Выбаргам, бліжэй да фінскай мяжы. Яна для мяне распачалася падчас чарговага сігналу трывогі са слоў дзядзькі: "Лёня, можа быць вайна". Упершыню ў гэты дзень я пабачыў на самалётах крыж замест нашай зорачкі. Дагэтуль пра магчымасць вайны простым людзям ніхто нічога не казаў, хаця адпаведныя гутаркі па гарнізонах хадзілі. Час ад часу кудысьці знікалі нашы афіцэры. Вакол быў лес ды нямецка-фінскія часці па другі бок мяжы.

***– А Вы паспелі эвакуявацца?***

– Так. Нам пашчасціла, што наступленне немцаў у гэтым напрамку пачалося на два дні пазней, чым па беларускім ды ўкраінскім. На чыгунцы ў Выбаргу, да якога мы нарэшце даехалі: я з двума чамаданамі і сястра з 2,5-месячным дзіцём на руках, было сапраўды спякотна. Нямецкія паветраныя знішчальнікі сваімі абстрэламі зверху не давалі магчымасці сесці ў цягнік. Толькі з трэцяга разу мы прарваліся на апошні, які рушыў у бок Ленінграда. У вагоне былі толькі 12 чалавек. Астатнія так і засталіся на чыгунцы.

***– Большая частка савецкай моладзі ў той час проста імкнулася патрапіць на ваенныя дзеі. Калі да Вас прыйшло такое жаданне?***

– У 43-м годзе. Тады быў набор хлопцаў 26-га года нараджэння, а я ж – 27-га. Але праз пэўныя хітрыкі атрымалася "ўсунуцца". Толькі на фронт я так і не патрапіў, бо ў апошні момант прыйшоў дазвол ехаць у Стаўрапольскі край, дзе быў мой бацька. "Канечне трэба ехаць, а паваяваць заўжды паспееш", – сказаў мне ваенкам.

Дарэчы, пасля я даведаўся, што ўвесь склад (450 чалавек) таго самага набору 43-га года падчас пераправы ў грузінскі Поці, куды і накіроўваўся, быў тарпедаваны. Ніхто не ацалеў… А я тады паехаў да таты.

***– Але ўсё ж такі Вы паспелі аддаць свой грамадзянскі доўг Радзіме?!***

– Так, у 1944-м. Ва ўзросце 17 гадоў мяне выклікалі ў шэрагі Чырвонай Арміі, і наступныя свае 30 год я аддаў ваеннай службе. У Польшчы ў 1945–1946-х гадах, змагаючыся з рознымі бандфарміраваннямі, быў паранены.

Яшчэ хацелася б узгадаць асабістую сустрэчу з маршалам Георгіем Жукавым. Гэта адбылося ў 1957-м годзе падчас яго візіту ў Мачулішчы, дзе я служыў. Мяне паставілі дзяжурным афіцэрам, і я асабіста дакладваў яму.

Пасля выхаду ў 1976 годзе ў запас, я пайшоў у БДУ, дзе працую дагэтуль.

***– Леанід Рыгоравіч, а што зараз робіцца дзеля таго, каб наша моладзь не забывалася на тое, дзякуючы каму была дасягнута тая перамога?***

– Праз Савет ветэранаў мы спрабуем вырашаць набалелыя пытанні ўдзельнікаў вайны, ладзім розныя сустрэчы, запрашаем не толькі ветэранаў, але таксама воінаў-інтэрнацыяналістаў, каб усе яны тлумачылі, апавядалі, перадавалі свае ўспаміны маладому пакаленню, каб яно цаніла мір і памятала тых, хто гэты мір ім падарыў.

# ВАЖНА АДРОЗНІВАЦЬ МІФАЛАГІЧНЫ ГЕРАІЗМ АД САПРАЎДНАГА

*Тая вайна была даўно, але гэта не значыць, што яе не было. Больш за тое, яна стала пэўным момантам адліку новага часу ў гісторыі нашага народа. Згубіўшы каля траціны насельніцтва, мы, сучаснікі, нясём адказнасць за тое, ці будуць памятаць пра вайну нашы нашчадкі і ў якіх колерах будуць яе ўспрымаць. Пра гэта мы пагутарым з Альбертам КОТАВЫМ, чалавекам, які перадае свае веды і свой погляд на тыя падзеі студэнтам БДУ, выкладаючы курс гісторыі і курс Вялікай Айчыннай вайны.*

***– Альберт Іосіфавіч, існуе меркаванне, што такіх вялікіх чалавечых страт з савецкага боку падчас вайны можна было пазбегнуць, калі б бальшавіцкае кіраўніцтва не імкнулася авалодаць пэўнымі рубяжамі да пэўных дат, такіх, напрыклад, як Дзень Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 1 Мая. Вашы думкі на гэты конт.***

– Такія з'явы былі, але ў асобных выпадках. Адваяваць такія цэнтры, як Кіеў, Кёнігсберг, – важная задача не толькі ў ваенным, але і ў псіхалагічным сэнсе. Падбадзёрыць салдат – жыццёва неабходна, але яшчэ больш важна – узняць настрой тым, хто застаўся чакаць, ды прымусіць іх паверыць у перамогу. У такія моманты, падчас вайны, шмат што залежыць ад духоўнага стану грамадства. Сіла духу народа адыграла, мажліва, больш значную ролю ў гэтай перамозе, чым асобныя ваенныя дасягненні.

***– А ці справядліва ўспрымаць кожнага, хто супрацоўнічаў з гітлераўцамі, як здрадніка, а кожнага партызана лічыць героем, як гэта рабілася даволі працяглы час?***

– Вельмі важна адрозніваць і ўмець аддзяляць міфалагічны гераізм ад сапраўднага. Ад міфаў трэба адыходзіць і глядзець у сутнасць праблемы, бачыць наступствы. Тое, што раней успрымалася як аксіёма, павінна быць прааналізавана згодна з сучаснымі поглядамі. Неабходна раскрываць галоўнае, бачыць асноўныя заканамернасці, уласцівыя таму часу, пэўнаму прамежку гісторыі. Абавязак гісторыка – шукаць праўду, якая палягае ў жыцці, а не слепа слухаць аўтарытэтаў, ці то палітычных, ці то навуковых, не затлумляючы галовы маладым – таленавітым, смелым, адукаваным. Моладзі трэба дапамагаць, не навязваючы ўласнага меркавання, дазваляючы ім самім, на аснове матэрыялаў з крытычным асэнсаваннем замежных аўтараў ці сваіх так званых "буржуяў", самастойна дайсці да сапраўднага гераізму іх дзядоў ды прадзедаў. Той подзвіг не падуладны нам, нікому. Ані тым, хто машынальна ўспрымае ўсё на "ўра", ані тым, хто кпіць з велічы тых падзей.

***– Васіль Быкаў у свой час казаў, што "гэтая вайна добра вядомая нам як жыхарам былога Савецкага Саюза, але застаецца зусім невядомай для нас як жыхароў незалежнай Беларусі ". Як пракаментуеце?***



**КОТАЎ Альберт Іосіфавіч** нарадзіўся 28 кастрычніка 1937 г. у в. Зафранцузская Грэбля Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Вязень фашысцкага канцлагера. Пасля школы-інтэрната ў 1955 г. паступіў на гістарычны факультэт БДУ. У студэнцкія гады пісаў вершы, удзельнічаў у драматычным гуртку, выступаў за зборныя БССР і СССР па лёгкай атлетыцы; майстр спорту СССР міжнароднага класа.

Працаваў настаўнікам-выхавацелем у Сёмкавагарадоцкай школе-інтэрнаце. Выкладаў у Магілёўскім машынабудаўнічым і тэхналагічным інстытутах. З 1978 г. працуе ў БДУ.

Аўтар больш за 100 навуковых прац па гісторыі аграрных адносін, Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны, міжнароднага маладзевага руху.

– Быкаў, бадай, самы смелы з усіх тагачасных пісьменнікаў, нават тых, у каго наклады кніг значна пераўзыходзілі ягоныя. Шмат чынілася перашкод на ягоным як творчым, так і жыццёвым шляху, але ён з гонарам іх пераадольваў. Ён мае права так казаць і як чалавек, які сам прайшоў тую вайну – Украіну, Румынію, Балгарыю, і як творца, які не быў ані афіцыйным гісторыкам, ані праўладным пісьменнікам. Я не маю права папракаць такіх пісьменнікаў за тое, што яны не карысталіся прынцыпам партыйнасці, але карысталіся праўдай жыцця ды адлюстроўвалі ўсё праз мастацкія вобразы. Мы павінны ім быць удзячнымі. Павінны супастаўляць, параўноўваць і шукаць праўду, якой бы балючай, а тым больш камусьці непажаданай, яна ні была.

Нягледзячы на мноства даследванняў па гэтай тэме і шмат выдадзеных мастацкіх твораў, застаецца яшчэ вялікая прастора для новых, больш сучасных ды шматбаковых думак і поглядаў.

***– Як Вы лічыце, ці дастаткова робіцца для таго, каб сучаснікі, у асноўным школьнікі ды студэнты, памяталі сапраўдных герояў і ўспрымалі тыя падзеі не праз заезджаныя стэрэатыпы, а праз сучаснае, сваё ўласнае бачанне той вайны?***

– Каб даць больш ці менш справядлівую ацэнку, неабходныя гады, дзесяцігоддзі. Трэба шукаць ісціну, якая ляжыць не на паверхні, расшчапіць ядро (як кажуць у фізіцы). Мы выкладаем згодна з нашай базай ведаў, нашым разуменнем. Гады праходзяць, а мы ўсё працягваем працаваць па ранейшых лякалах… але той час ужо прайшоў. Нашыя юнак ды дзяўчынка ў школе, а тым больш у ВНУ, набіраюцца сучасных ведаў, але наш выкладчык за імі не паспявае. Каб наблізіцца да вырашэння праблемы, пачаць трэба не са школьніка ці студэнта, а з выкладчыка і настаўніка.

***– Альберт Іосіфавіч, што Вы можаце параіць беларусам, асабліва моладзі, напярэдадні нашага агульнага свята – Дня Перамогі?***

– Самае важнае ў перамозе – зразумець некаторыя памылкі, што мяжуюць са злачынствам, і перадаць маладым неміфізаваную, чыстую праўду пра тую вайну. Толькі такая памяць можа быць асновай для працягу традыцый і генератарам прагрэсу, які будзе падмуркам для наступных пакаленняў.

Зараз часцяком можна пачуць, што "навошта тады нашы салдаты так ваявалі, калі сучасныя немцы жывуць лепш за нас. Адрачомся ад сталінізму і разам з ім ад той перамогі". Але жудасны таталітарызм – адно, а вялікая перамога – іншае, хаця вядома, што яны не ў адным месцы скрыжуюцца. Галоўнае – не перакідацца без розуму ад калектывізму да індывідуалістычнага грамадства спажывання. Той салдат зрабіў усё, каб было мірнае неба над галавою. Наш абавязак – належным чынам выхаваць вас, а ваш – абараніць тую вялікую перамогу, каб сучасная ці будучая дзяржава мела не меншы аўтарытэт, чым тая, у складзе якой гэта перамога здабывалася.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Алесь НОВІКАЎ**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

УНІВЕРСІТЭТ

ЮБІЛЕІ

# ГОДНАСЦЬ БДУ АДСТОЙВАЮЦЬ ЮРЫСТЫ

***Стварэнню больш чым 30 юрыдычных асоб, заснавальнікам якіх з'яўляецца універсітэт, у многім садзейнічала ўпраўленне прававой работы. Яно ўзнікла ў 2000-м годзе, калі БДУ якраз набыў новы статус і стаў лічыцца не толькі вышэйшай навучальнай установай, але і комплексам, які ўключае навукова-даследчыя і вучэбныя ўстановы, філіялы, самастойныя цэнтры, прадпрыемствы і г.д. Універсітэту было дадзена права ажыццяўляць гаспадарчую дзейнасць.***

Упраўленне прававой работы занялося распрацоўкай статутаў юрыдычных асоб, дакументаў, якія датычыліся іх узнікнення і рэарганізацыі. Таксама прыйшлося ствараць палажэнні аб новых структурах, функцыянальных абавязках іх супрацоўнікаў, праводзіць шматлікія кансультацыі па рэалізацыі гэтых дакументаў. Вялікую частку працы заняло юрыдычнае суправаджэнне гаспадарчай дзейнасці універсітэта: заключэнне пагадненняў на адукацыйныя і іншыя паслугі, удзел у тэндэрах, у тым ліку на дзяржаўным узроўні, і інш.

Аднак штодзённая праца ўпраўлення не зводзіцца да колькасці аформленых дакументаў. Любая гаспадарчая дзейнасць рана ці позна прадугледжвае ўзнікненне спрэчных сітуацый.

Судовыя іскі прад'яўляліся як ад універсітэта, так і да яго. За 10 апошніх гадоў упраўленне прававой работы прыняло ўдзел у больш чым 200 судовых справах. Па словах начальніка УПР Алены ШВАКАВАЙ, яе падначаленым найбольш запомнілася спрэчка з "МакДональдс" аб парадку спынення яго дзейнасці на час будаўніцтва факультэта міжнародных адносін на Прывакзальнай плошчы. Толькі працяглымі перамовамі ўдалося дасягнуць міравога пагаднення на ўмовах, якія б задавальнялі БДУ. Каб пераканаць другі бок у справядлівасці сваіх доказаў, юрыстам універсітэта прыйшлося падымаць архівы 40-х гадоў, дзе і знайшлі сведчанне таго, што дадзеная тэрыторыя заўсёды належала БДУ. Пасля заканчэння будаўніцтва перамовы з "МакДональдс" будуць узноўлены.

Яшчэ амаль 2 гады цягнуўся судовы працэс з маскоўскай фірмай, якая прэтэндавала на цэлы паверх новага будынка Інстытута журналістыкі на вул. Кальварыйскай як былы дольшчык забудовы, перададзенай на баланс БДУ ў незакончаным выглядзе. Універсітэту быў прад'яўлены іск на 1 млрд 600 тыс. долараў. І юрыстам спатрэбілася шмат намаганняў, каб яго адхіліць.

Аднойчы прыйшлося разам з судовымі выканаўцамі дабівацца вызвалення будынка па вул. Чарнышэўскага, які не хацелі саступаць былыя гаспадары.

Цікавы для юрыдычнай практыкі быў судовы працэс з беларускім біржавым банкам, які збанкруціўся і не мог вярнуць універсітэту яго ўкладанне ў памеры 1,2 млн долараў. Супрацоўнікі ўпраўлення прававой работы на працягу некалькіх гадоў удзельнічалі не толькі ў судовых пасяджэннях, але і ў распродажы маёмасці банка. Гэта дапамагло нашай навучальнай установе вярнуць частку сваіх грошай, каля 240 тыс. долараў.

Юрыстам упраўлення давялося адстойваць інтарэсы універсітэта і перад мытным камітэтам, які неправамерна прымяняў сур'ёзныя санкцыі да яго юрыдычных асоб. У выніку судовых разбораў БДУ выйграў у 2001 г. у мытнікаў тры іскі на агульную суму каля 2 млн долараў.

Аднак самае складанае, на думку Алены Швакавай, – удзельнічаць у разглядзе грамадзянскіх спраў, якія датычацца звальненняў з працы. І цяжка гэта рабіць у першую чаргу з маральнага пункта погляду. У той час, як чалавек адстойвае толькі свае правы як асобы, юрысты ўпраўлення з'яўляюцца ў суд, каб абараняць інтарэсы універсітэта як арганізацыі. Каб перамагчы не рэсурс і сіла, а заканадаўства, па словах Алены Мікалаеўны, важна паводзіць сябе ў такіх выпадках непрадузята і апеляваць толькі да нормаў закона. Здараліся выпадкі, калі былых супрацоўнікаў універсітэта не задавальняла, на якой падставе з імі былі спынены працоўныя адносіны. Іншыя не пагаджаліся з мерамі дысцыплінарных спагнанняў: вымовамі, заўвагамі і г.д. Кожны раз прыходзілася ўнікліва збіраць доказную базу.

Судовых працэсаў, якія б датычыліся адлічэння студэнтаў, за апошнія гады было толькі 2–3 выпадкі. Па словах Алены Швакавай, БДУ ніколі лёгка не адмаўляецца ад сваіх навучэнцаў. Наадварот, ён заўсёды змагаецца за іх паспяховасць. І студэнты гэта ведаюць. Ва універсітэце створана цэлая сістэма нарматыўных дакументаў, якая дазваляе маладому чалавеку вярнуцца да вучобы. Аднак, калі ніякія захады не дапамагаюць, той усё ж можа быць адлічаны. І наракае ён часцей толькі на сябе.

Юрысты БДУ заўсёды ахвотна ўдзельнічаюць у распрацоўцы палажэнняў усемагчымых конкурсаў, такіх як, напрыклад, конкурс "Найлепшы маладзёжны праект". Тут кажуць, што ствараць нешта новае заўсёды цікава, тым больш калі ёсць магчымасць падысці да вырашэння праблемы творча.

Алена Мікалаеўна падкрэслівае, што ў БДУ як буйной структуры ёсць свае асаблівасці ў развіцці прававой базы. Яго статут мае на ўвазе ўзнікненне тых спрэчных момантаў, якія рэдка здараюцца ў іншых ВНУ. Гэта патрабуе адстойвання інтарэсаў БДУ амаль кожны дзень у розных інстанцыях.

Узровень прававой працы вельмі высокі. Ён падразумявае прамы кантакт з міністэрствамі, Саветам Міністраў, Адміністрацыяй прэзідэнта і г. д. І ў любых выпадках супрацоўнікам упраўлення даводзіцца дэманстраваць сваю высокую кваліфікацыю. Яны не маюць права на памылку і павінны заўсёды абараняць годнасць сваёй установы. Апошняя ў сваю чаргу пастаянна садзейнічае іх прававой практыцы, чым і паглыбляе вопыт.

**Ганна ЛАГУН**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА



*На фота (справа налева): Аксана Харошка, Дар'я Ермаловіч, Алена Швакава і Марыя Абламейка*

УШАНАВАННІ

# *На Вяршыні*

***Інстытут журналістыкі БДУ ўдастоены спецыяльнага прыза журы VI Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу "Тэлевяршыня". Узнагарода прысуджана за ўклад у развіццё айчыннай тэлежурналістыкі і падрыхтоўку высокапрафесійных кадраў.***

У сваёй прамове ў вялікай зале Палаца Рэспублікі дырэктар Інстытута журналістыкі Сяргей ДУБОВІК падкрэсліў, што ўзнагарода належыць не толькі цяперашняму пакаленню студэнтаў і выкладчыкаў, але перш за ўсё тым, хто, пачынаючы з 1944 г., вучыўся і вучыў журналістыцы. Акрамя таго, ён асобна адзначыў той факт, што больш за палову лаўрэатаў конкурсу – людзі, якія самі нядаўна скончылі факультэт журналістыкі, у тым ліку і тыя, хто гэтыя ўзнагароды ўручаў.

У каментары нашай газеце Сяргей Валянцінавіч ацаніў гэтае прызнанне з боку журы на чале з міністрам інфармацыі Беларусі Алегам Праляскоўскім як сведчанне таго, што ўсе поспехі беларускай тэлежурналістыкі знітаваныя з дзейнасцю Інстытута журналістыкі, а раней факультэта журналістыкі.

Дарэчы, Інстытут журналістыкі пазалетась атрымаў "Залатую літару" на IV Нацыянальным конкурсе друкаваных СМІ ў намінацыі "Партнёрства". Зусім нядаўна Інстытут журналістыкі БДУ стаў уладальнікам спецыяльнага дыплома і хрустальнага глобуса інтэрнэт-прэміі "ТІВО-2010". Журы высока ацаніла веб-рэсурс *www.journ.bsu.by*, а таксама адзначыла працу вучэбнай лабараторыі "Веб-журналіст" (кіраўнік – дацэнт Аляксандр Градзюшка) па стварэнні сайтаў раённых газет.

Сяргей Дубовік заўважыў, што за апошнія два гады адбыліся якасныя зрухі ў арганізацыі навучальнага працэсу на факультэце. Студэнты задзейнічаныя ў працы ЭМТТРА (Эксперыментальнае моладзевае творчае тэлерадыёаб'яднанне): рыхтуюць сюжэты для тэлеканала ЛАД, а таксама для Беларускага радыё. Заняткі па кафедры тэлебачання і радыёвяшчання праходзяць на базе тэлецэнтра. Студэнты маюць магчымасць непасрэдна працаваць з самым сучасным абсталяваннем. Створаныя ўмовы дазваляюць рыхтаваць да 5 курса спецыялістаў, якім практычна не патрабуецца адаптацыя, яны адразу ўліваюцца ў працоўныя калектывы і нароўні з дасведчанымі журналістамі ўдзельнічаюць у тэлевізійным працэсе. Акрамя таго, наладжана цесная сувязь з кіраўніцтвам усіх каналаў тэле- і радыёвяшчання.

"Наогул, прафесійная падрыхтоўка сённяшніх выпускнікоў нашмат лепшая, чым у тых, якія выходзілі 3 гады таму, у першую чаргу ў плане працы з сучаснай тэхнікай, – лічыць Сяргей Дубовік. – Зараз усё гэта ў нас ёсць, і ўжо з 1 курса студэнты не баяцца сядзець перад камерай, весці перадачы і г.д. Доказам служыць меркаванне саміх кіраўнікоў беларускіх каналаў, а таксама іх рэальная зацікаўленасць у нашых спецыялістах. Сёлета, паводле папярэдняга размеркавання, 6 чалавек атрымалі накіраванне на БТ, 2 чалавекі на АНТ, па 3 чалавекі на МІР і СТБ, якое, дарэчы, стваралася групай нашых выпускнікоў.

Гэта значыць, што Інстытут журналістыкі знаходзіцца на правільным шляху і што мы максімальна задавальняем патрабаванні ў кадрах. Да таго ж, нашы выпускнікі цяпер актыўна арганізоўваюць гарадскія тэлеканалы ў рэгіёнах".

Наступнымі мэтамі Інстытута журналістыкі Сяргей Валянцінавіч адзначыў адкрыццё новых спецыяльнасцяў і новых кірункаў спецыяльнасцяў, актывізацыю павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, а таксама стварэнне ў найбліжэйшы час школы тэлевядучага.

Прафесійную падрыхтоўку журналістаў для аўдыёвізуальных СМІ здзяйсняе кафедра тэлебачання і радыёвяшчання (загадчык – дацэнт Вячаслаў Булацкі). З моманту стварэння ў 1967 г. ёю выпушчана 2,5 тысячы спецыялістаў.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

АБ'ЯВЫ

## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, тэхналогіі праграмавання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРЫ англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, агульнанавуковых дысцыплін;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРЫ тэорыі і практыкі перакладу, агульнанавуковых дысцыплін.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

## ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

– Старшага выкладчыка кафедры рэабіліталогіі;
– Загадчыка кафедры кіравання фінансамі і маёмасцю;
– Выкладчыка кафедры кіравання фінансамі і маёмасцю;
– Выкладчыка кафедры праваых дысцыплін.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, ДІКСТ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.

## РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ
**запрашае**
**на павышэнне кваліфікацыі**
**ў маі-чэрвені 2010 г.**
**выкладчыкаў і спецыялістаў**
**устаноў адукацыі**
**па наступных кірунках:**

– Традыцыйныя і нетрадыцыйныя канфесіі ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць (для выкладчыкаў) – 10.05-21.05.
– Сістэма давузаўскай падрыхтоўкі: айчынны і замежны вопыт (для выкладчыкаў факультэтаў давузаўскай падрыхтоўкі) – 10.05-21.05.
– Міжнароднае супрацоўніцтва ВНУ і экспарт адукацыйных паслуг (для кіраўнікоў і спецыялістаў па забеспячэнніі міжнародных сувязяў) – 10.05-21.05
– Прафілактыка дэвіянтных і залежных паводзін ва ўстановах адукацыі (для педагогаў, педагогаў-псіхолагаў, выкладчыкаў) – 17.05-28.05.
– Сістэма кіравання якасцю адукацыі ў ВНУ (для выкладчыкаў) – 17.05-28.05.
– Метадалогія і методыка дысертацыйнага даследавання (для навуковых кіраўнікоў аспірантаў і магістрантаў, загадчыкаў аспірантур, маладых вучоных) – 31.05-11.06.

Для папярэдняга запісу ў групы тэл.: 222-83-03, 200-20-47.

Наш адрас: 220007 г. Мінск, вул. Маскоўская, 15; РІВШ, каб. 320, 319; тэл./факс 200-25-51.

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю са студэнтам юрфака – чэмпіёнам Еўропы па грэка-рымскай барацьбе Аляксандрам Кікіневым** – "Минский курьер" (24.04).

**Узнагарода БДУ на ТІВО-2010** – "Настаўніцкая газета" (24.04); "Знамя юности" (23.04).

**Загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Людміла Саянкова пра новую спецыяльнасць "літаратурная работа (творчасць)"** – "Культура" (24-30.04).

**Пра новыя спецыяльнасці Інстытута журналістыкі дырэктар Сяргей Дубовік** – "Минский курьер" (23.04); "Минск-новости"(23.04).

**Акцыя абсерваторыі БДУ ў гонар Міжнароднага дня астраноміі** – "Звязда" (23.04); "Минск-новости" (23.04).

**Інтэрв'ю з дэканам эканамічнага факультэта Міхаілам Кавалёвым наконт перспектыў эканамічнага развіцця нашай краіны** – "Звязда" (21.04).

**Мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка"** – БелТА (19.04).

**Удзел навуковых распрацовак БДУ ў міжнародных выставах** – БелТА (15.04); "Вечерний Минск" (16.04); "Минск-новости" (16.04).

**Інтэрв'ю з дырэктарам абсерваторыі БДУ Альгердам Кузнечыкам** – "Беларуская ніва" (16.04).

**Канцэрт ансамбля танца "Крыжачок" БДУ** – "Минск-новости" (14.04).

**Інтэрв'ю з дэканам філалагічнага факультэта БДУ прафесарам Іванам Роўдам** – БелТА (08.04).

**Прафесійна-псіхалагічнае сумоўе для абітурыентаў** – "Рэспубліка" (06.04); "Вечерний Минск" (06.04); "Звязда"/"Чырвоная змена" (07.04).

**Перамога студэнтаў БДУ ў чэмпіянаце Расіі па "Што? Дзе? Калі?"** – naviny.by (05.04); "Звязда" (08.04); "Народная газета" (09.04).

**Творы ўдзельнікаў літаратурна-музычнай гасцёўні Студгарадка БДУ** – "Маладосць" № 3.

**Інтэрв'ю з дэканам ФПМІ Паўлам Мандрыкам з нагоды 40-годдзя ФПМІ** – "Настаўніцкая газета" (20.03).

**IV геалагічныя чытанні з нагоды 15-годдзя кафедры дынамічнай геалогіі геаграфічнага факультэта БДУ** – "Настаўніцкая газета" (20.03).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# АДШЛІФАВАНЫ АЛМАЗ

***З чэмпіянату Еўропы па грэка-рымскай барацьбе, які праходзіў у Баку, чацвёртакурснік завочнага аддзялення юрыдычнага факультэта БДУ Аляксандр КІКІНЕЎ вярнуўся з медалём найвышэйшай пробы.***



У барацьбе за яго ён здолеў абысці чатырох супернікаў – прадстаўнікоў Грузіі, Украіны, Расіі і Азербайджана. Па словах Аляксандра, наймацнейшым з іх быў украінец, а псіхалагічна цяжэй за ўсё было дужацца са спартсменам з Азербайджана (гаспадар турніру ўсё ж такі).

Зараз у скарбонцы нашага студэнта ёсць еўрамедалі ўсіх вартасцяў: у 2003 на чэмпіянаце ў Сербіі ён стаў уладальнікам сярэбранага медаля, а летась у Літве – бронзавага. У планах – перамагчы на спаборніцтвах, якія адбудуцца сёлета ў верасні ў Маскве.

Свае ўзнагароды Аляксандр не дзеліць па значнасці. "Кожны з іх дарагі і памятны па-свойму, кожны медаль – вялізная праца, і не толькі мая, але і трэнера". А настаўнік у спартсмена – асоба выбітная: заслужаны майстар спорту, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў (1996), трохразовы чэмпіён Еўропы Сяргей Мікалаевіч Ліштван. "Гэта вельмі адказны чалавек і аўтарытэтны майстар", – са шчырай павагай гаворыць пра яго Аляксандр, не хаваючы, што "заклад поспеху – гэта, галоўным чынам, прафесіяналізм і падтрымка трэнера".

Шлях у вялікі спорт пачаўся ў чэмпіёна ў дзевяцігадовым узросце, калі Аляксандр разам з бацькам упершыню прыйшоў у спартзалу. Сёння ён з усмешкай успамінае пра свае адчуванні на першых спаборніцтвах. "У 10–12 гадоў цяжэй за ўсё было перамагчы ўласныя страхі, хваляваўся: ці змагу, ці хопіць сіл і вытрымкі, ці буду мацнейшы за суперніка. А зараз ты выходзіш на дыван, разумеючы, што ўсё можа скласціся па-рознаму, галоўнае – не ўпадаць у роспач. Самае дарагое – гэта сям'я, шчасце і спакой блізкіх. Бо ўсе нягоды і радасці лягчэй перажываць са сваімі роднымі".

Вучобу на юрфаку Аляксандр Кікінеў сумяшчае са службай у спецыяльным падраздзяленні па барацьбе з тэрарызмам "Алмаз". Вось так і скрыжаваліся ў жыцці яго прыхільнасці: любоў да спорту і да правапарадку.

**Ларыса ПЕТРАВЕЦ**

*P.S.* На гэтым жа чэмпіянаце бронзавы медаль у вазе 120 кг заваяваў яшчэ адзін студэнт юрыдычнага факультэта Аляксей Шэмараў.

НАВІНЫ

## СТУДГАРАДКА

***20 красавіка самыя эрудзіраваныя студэнты інтэрнатаў БДУ сабраліся, каб пазмагацца на традыцыйным турніры знаўцаў Студгарадка – "Брэйн-рынгу".***

Вялі інтэлектуальны бой 14 камандаў. Пытанні былі рознай тэматыкі і мелі свой рэйтынг складанасці. Можна было адказаць на меншую колькасць пытанняў, але пры гэтым набраць больш балаў, чым тыя, хто даў больш правільных адказаў. Былі і такія пытанні, адказы на якія каманды так і не змаглі знайсці. У выніку перамогу ў турніры заваявала каманда інтэрната № 2. Віншуем!

***

***Не спыняецца ні на хвіліну ў Студэнцкім гарадку і спартыўнае жыццё.***

20 красавіка прайшлі спаборніцтвы па баскетболе на Кубак дырэкцыі, у якіх перамогу атрымала каманда супрацоўнікаў Студгарадка; 20 і 22 красавіка ў рамках Спартакіяды інтэрнатаў адбыліся спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы. На чарзе працяг Спартакіяды – спартыўнае арыентаванне, якое пройдзе 6 мая.

***

***21 красавіка студэнты інтэрнатаў № 2 і № 5 наведалі музычна-забаўляльнае мерапрыемства "Рытмы вясны".***

Праграма складалася з канцэрту, на якім студэнты – суседзі па інтэрнатах – выступілі з сумеснымі творчымі нумарамі, і, вядома ж, самай чаканай студэнтамі часткі любога свята – дыскатэкі.

***

***З верасня 2006 г. у Студгарадку дзейнічае праект Каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў "Годнае дзяцінства".***

Галоўная мэта – дапамагчы дзецям-сіротам паверыць у сябе, здабыць веру ва ўласныя сілы, а студэнтам – садзейнічаць маральнаму развіццю асобы. Ужо былі праведзеныя дабрачынныя акцыі ў дзіцячых дамах і школах-інтэрнатах Слуцка, Смаргоні, г.п. Чырвоная Слабада і Салігорска. 28 красавіка студэнты-актывісты наведалі дзіцячы дом у в. Станькава Дзяржынскага раёна, дзе арганізавалі ролевыя і рухавыя гульні, розныя конкурсы, пазнавальна-развіццёвыя, тэматычныя гутаркі, а таксама канцэртную праграму.

КОНКУРСЫ

# І мы прайшлі па той вайне…

***Конкурс чытальнікаў, прысвечаны 65-годдзю Вялікай Перамогі, адбыўся на філфаку.***

Выразнае, пранікнёнае чытанне на памяць мастацкіх твораў, прысвечаных тэме Вялікай Айчыннай вайны, было ацэнена журы, у склад якога ўваходзілі выкладчыкі філалагічнага факультэта, а таксама паэт, празаік, гумарыст Анатоль Зэкаў.

Настроіла аўдыторыю на ўзвышаны лад прэзентацыя, падрыхтаваная Фундаментальнай бібліятэкай, якая суправаджала песню “Мой мілы, калі б не было вайны”. У час конкурсу гучалі вершы У. Караткевіча, Р. Барадуліна, А. Лойкі, К. Сіманава, Ю. Друнінай, Р. Куранёва. Улічвалася веданне тэксту, выразнасць маўлення, эмацыйнасць чытання, акцёрскае майстэрства і нават знешні выгляд чытальніка.

Пераможцамі конкурсу сталі першакурснік філфака Павел Лагойка і будучы географ Ганна Дашук – яны падзялілі 1 месца, прытым Ганна была адзіным выступоўцам з прадуманым сцэнічным касцюмам: для чытання верша Юліі Друнінай “Бінты” дзяўчына апранулася як ваенная медсястра. Другое месца заслужана заняў другакурснік гумфака Раман Вайцяховіч, а трэцяе падзялілі Вікторыя Бежалева (філфак) і Ілья Ільшонак (біяфак).

Упрыгожаннем імпрэзы сталі ваенныя песні ў выкананні студэнтак журфака і філфака. Нібы ў знак таго, што студэнцкія сэрцы б’юцца ў адным рытме, Таццяна Гарбар (1 курс журфака) і Вольга Кірлік (1 курс філфака) выпадкова падрыхтавалі адную і тую ж песню – таму і выканалі яе разам, прадэманстраваўшы пры гэтым здольнасць да імправізацыі і ўразіўшы слухачоў прафесіяналізмам спеваў.

Усе пераможцы атрымалі дыпломы ад ФБ БДУ і падарункі ад Саюза жанчын БДУ – арганізатараў конкурсу. А студэнткі фізічнага факультэта Ганна Ермакова і Надзея Кухарчык, якія дэкламавалі ўласныя вершы, атрымалі яшчэ і буклет “Сны з вайны” з аўтографам Анатоля Зэкава.

Аб значнасці падобных імпрэз для выхавання моладзі, падтрымання пераемнасці пакаленняў гаворыць вядучы бібліятэкар аддзела гуманітарна-асветніцкай работы ФБ БДУ Ірына Шкілёнак:

"Сённяшніх студэнтаў цяжка здзівіць, але можна ўразіць, усхваляваць, і вельмі важна ўскалыхнуць, яшчэ раз нагадаць ім пра тое, што стала гісторыяй. Падобныя конкурсы неабходныя, каб студэнты самі адчулі, што адбывалася ў тыя страшныя гады. Калі яны чыталі вершы, яны зноў праходзілі сцяжынамі вайны – і праводзілі за сабой слухачоў".

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# На сувязі з грамадствам

***4 дні доўжыўся III адкрыты студэнцкі PR-форум “Папараць-кветка”. Больш за 500 студэнтаў з Беларусі, Украіны, Літвы, а таксама спецыялісты “пашыралі далягляд з PR”.***



*Каб заваяваць увагу журы, студэнты падчас абароны праектаў былі гатовы нават пераўвасобіцца ў трусоў*

Ініцыятыва правядзення форума належыць дацэнту Ірыне Сідорскай. Менавіта яна кожны год матывуе студэнтаў 4 курса на правядзенне конкурсу. Арганізатарамі з’яўляюцца кафедра тэхналогій камунікацыі Інстытута журналістыкі БДУ і кансалтынгавая кампанія Інстытут грамадскіх сувязяў (Інстытут PR).

Традыцыйна адбылася навукова-практычная канферэнцыя і конкурс студэнцкіх PR-праектаў у двух блоках: сацыяльным і камерцыйным. Членамі журы такіх мерапрыемстваў звычайна бываюць патэнцыйныя працадаўцы і інвестары, таму гэта выдатная магчымасць паказаць сябе і пачаць сваю кар’еру ў PR. У адзін з дзён адбылася прэзентацыя кнігі “Эфектыўныя камунікацыі са СМІ” аўтара праекта “Папараць-кветка” І.У. Сідорскай. На такія актуальныя тэмы, як піяр культурных праектаў, піяр у Інтэрнэце, антыкрызісны піяр, прафесіяналамі былі праведзены круглыя сталы, трэнінгі, майстар-класы.

Пераможцамі Кірмаша студэнцкіх PR-праектаў у сацыяльным блоку сталі Раман Талалуеў, Станіслаў Ціханенка (філалагічны факультэт ГрДУ імя Янкі Купалы), у камерцыйным – Дар’я Жарабіцкая і Андрэй Сахарук (Інстытут журналістыкі БДУ). Таксама дыпломамі былі адзначаны пераможцы ў розных намінацыях.

Асаблівасцю “Папараць-кветкі” сёлета стаў новы фармат: усе акрэдытаваныя ўдзельнікі адправіліся ў PR-круіз. Іх чакаў спецыяльны інструктаж, вялікія адкрыцці і арыентацыя па зорках. Упершыню былі праведзены экскурсіі ў беларускія піяр-агенцтвы.

Са слоў аднаго з арганізатараў мерапрыемства, Кацярыны Саковіч, “піяршчык – гэта сувязны паміж кампаніяй і яе аўдыторыяй, які дазваляе ім чуць і разумець адзін аднаго, а таксама быць карыснымі адзін для аднаго. Піяр можа быць толькі празрыстым і праўдзівым, гэта сяброўства, гэта любоў, гэта назаўсёды...”

**Наталля КЕЗІК**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# Выдадзена ў БДУ

***З пачатку бягучага года выдадзена 51 кніга і брашура агульным аб’ёмам 379,04 уліково-выдавецкага аркуша. У друкарні сваёй чаргі чакаюць яшчэ 58 кніг.***

***Прапануем увазе чытачоў некаторыя з выданняў, якія нядаўна пабачылі свет.***

**Гирилович И.С. Памятник природы республиканского значения «Дубрава»** : пособие для студентов биол. и геогр. фак. / И.С. Гирилович, М.А. Джус. – Минск : БГУ, 2009. – 103 с. : ил.

**Соловьев А.И. Основы информационно-коммуникационной деятельности** : пособие для студентов Института журналистики БГУ / А.И. Соловьев. – Минск : БГУ, 2009. – 191 с.: ил.



**Янович Е.И. Русский язык в историческом освещении** : учеб.-метод. пособие / Е.И. Янович. – Минск : БГУ, 2009. – 223 с.

**Пипченко Н.М. Современный русский язык** : Синтаксис словосочетания и простого предложения : учеб. пособие / Н.М. Пипченко. – Минск : БГУ, 2009. – 215 с.

**Шалапенок Е.С. Прикладная паразитология** : учеб. пособие / Е.С. Шалапенок. – Минск : БГУ, 2009. – 184 с.

**Медведев Г.А. Диффузионные модели в финансовом анализе** / Г.А. Медведев. – Минск : БГУ, 2010. – 159 с. : ил.

**Колосова Т.Е. Основы литологии** : пособие / Т.Е. Колосова. – Минск : БГУ, 2009. – 163 с. : ил.

**Кавалёва Р.М. Фальклорная практыка : метад. рэкамендацыі і праграма-апытальнік** : для студэнтаў I курса філал. фак., якія навучаюцца па спец. 1-21 05 01 "Беларуская філалогія", 1-21 05 02 "Руская філалогія", 1-21 05 04 "Славянская філалогія" / Р. М. Кавалёва, В.В. Прыемка, Т. А. Марозава. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : БДУ, 2009. – 176 с.



**Здоровый образ жизни** : сб. ст. Вып. 7 / редкол. : В.М. Киселев (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2009. – 155 с. : ил.

**Лаптева Н.Е. Немецкий язык для студентов-юристов** : практикум = Deutsch fűr Jurastudenten : Arbeitsbuch / Н. Е. Лаптева, И.Е. Ковалева. – Минск : БГУ, 2009. – 176 с.

**Зоология : учебные тексты** = Zoology : Educational Texts : пособие для студентов I курса биол. фак. БГУ / сост. : Т. А. Богомолова [и др.]. – Минск : БГУ, 2009. – 70 с.

**Абрамович В.К. Социально-психологический тренинг** : программы развивающей тематики : учеб.-метод. пособие / В.К. Абрамович, Н.А. Ивинская, И.А. Челядинская, О.В. Шапошникова ; под общ. ред. Р.П. Попка. – Минск : БГУ, 2010. – 111 с. – (Психологический спектр познания).

**Этналогія Беларусі** : традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве : вучэб.-метад. дапам. / Т.А.Навагродскі [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009. – 335 с. : іл.




**Исследование переходных процессов в полупроводниковых структурах** : пособие / Н.А. Поклонский [и др.]. – Минск : БГУ, 2009. – 103 с.

**Самкина Т.А. Немецкий язык** : пособие для студентов-заочников фак. филос. и соц. наук = Deutsch : Studienmaterialien fűr Fernstudenten (Sozialwissenschaften) / Т. А. Самкина. – Минск : БГУ, 2009. – 99 с.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

30 красавіка 2010 года
Падпісана да друку 28.04.2010 г.
Зак. . Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП “Выдавецкі цэнтр БДУ”
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*